# Як пазначыць чужы закапірайчэны кантэнт

Каб выкарыстоўваць чужы кантэнт, трэба атрымаць дазвол ад аўтара пад пэўнымі умовамі. Кожны выпадак можа быць унікальным.

Калі твор з'яўляецца грамадскім набыткам яго можна свабодна выкарыстоўваць без атрымання якіх-небудзь дазволаў. Звычайна гэта кантэнт, аўтары якога памерлі 50 год назад.

# Як пазначыць чужы кантэнт пад CC ліцэнзіяй

Калі вас цікавіць чужы кантэнт, які ліцэнзуецца адной з ліцэнзій CC, то варта звярнуць увагу на форму ліцэнзіі - яна адразу пазначае правілы выкарыстоўвання кантэнту. Вам неабходна паглядзець, якая з шасці ліцэнзій выкарыстана на пазычаемым творы, і выканаць яе ўмовы, сыходзячы з віда ліцэнзіі (глядзіце буклет [Крок 1]).

*Напрыклад, пазнака CC BY-SA 4.0 Int, значыць, што гэта ліцэнзія - аўтарства на тых самых умовах.*

# Як пазначыць аўтара?

Каб пазначыць аўтара - неабходна вызначыць, хто з'яўляецца аўтарам кантэнту, які вы бярэце.

Калі не відавочна, хто з'яўляецца аўтарам твору - паспрабуйце знайсці інфармацыю пра аўтара ці побач з матэрыялам, ці у футэры сайту, ці на старонцы пра сайт.

# Як пазначыць крыніцу?

Крыніцай ў дадзеным выпадку будзе з'яўляцца сайт, кніга (у тым ліку электронная), навуковы артыкул і інш.

**Калі крыніца:**

- **сайт** - трэба пакінуць спасылку на яго (url) прычым да таго месца, дзе знаходзіцца сам твор, а не проста на сайт!
- **кніга ці часопіс** - трэба пакінуць назву крыніцы, аўтараў, год выдання і - пажадана - старонку, з якой запазычваеце.

Пазначэнне крыніцы дазволіць іншым мець доступ да самога твору ці матэрыялу.

# Як пазначыць ліцэнзію?

Першапачаткова - праверце пажаданні аўтара наконт таго, якім чынам ён хоча быць пазначаны. Гэтую інфармацыю можна знайсці ці побач з творам, ці ў футэры сайта, ці на адмысловай старонцы з палітыкай выкарыстання кантэнту на сайце.

Апасля гэтага - напішыце назву ліцэнзіі і зрабіце на яе спасылку, каб наведвальнікі вашага рэсурсу змаглі азнаёміцца з яе ўмовамі.

**Абраць ліцэнзію можна з дапамогай Абірача на сайце Creative Commons -** creativecommons.org/choose/?lang=be

*На сённяшні час існуе мноства рэсурсаў, якія распаўсюджваюць кантэнт пад свабоднымі ліцэнзіямі (асабліва фота і адукацыйныя тэксты). Шукайце іх!*

**Схема пазначэння:** <Аўтар>, <Назва твору>, <Крыніца>, <Ліцэнзія>

**Прыклад пазначэння чужога твора:**
Svetit, кансольныя паштоўкі, *github.com/svetit/2016-postcards-console*, Creative Commons BY-SA 4.0